### *Список використаної літератури*

1. Бондаренко І. Розкоші і злидні японської поезії : японська класична поезія в контексті світової та української літератури / І. Бондаренко. – К. : Вид. дім Дмитра Бурого, 2010. – 566 с.
2. Лермонтов Ю. Избранные произведения. В 2 т. Т. 1. Стихотворения и поэмы 1828–1835 / Ю. Лермонтов. – Л. : Сов. писатель, 1957. – 412 с.
3. Максимов Д. Поэзия Лермонтова / Д. Максимов // Ю. Лермонтов Избранные произведения. В 2 т. Т. 1. Стихотворения и поэмы 1828–1835 / Д. Максимов. – Л. : Сов. писатель, 1957. – С. 5–93.
4. Мілош Ч. Придорожній песик / Чеслав Мілош. – Львів : Літопис, 2001. – 334 с.
5. Тодоров Ц. Обличчям до екстреми / Ц. Тодоров ; пер. з фр. Я. Салиги. – Львів : Літопис, 2000. – 415 с.
6. Наливайко Д. Теорія літератури й компаративістики / Дмитро Наливайко. – К. : Вид. дім «Києво-Могилянська академія», 2006. – 347 с.
7. Miłosz Czesław. Piesek przidrożny / Czesław Miłosz. – Kraków : Wydawnictwo «Znak»,1997. – 317 s.
8. Żywot Sienkiewica / pod red. Józefa Szczublewskiego. – Warszawa : Państwowy Instutut Wydawnicy, 1989. – 465 s.


УДК 821. 161.3 – 14.911. 345.06: 008 (4-15)

***Наталья Пазняк***

# АПАЗІЦЫЯ «СВАЁ» / «ЧУЖОЕ» Ў БЕЛАРУСКАЙ УРБАНІСТЫЧНАЙ ПАЭЗІІ


У артыкуле разглядаецца спецыфіка прысутнасці антытэзы «сваё» / «чужое» у межах беларускай урбаністычнай паэзіі.

**Ключавыя словы:** гарадскі текст, прастора, літаратурны вобраз, урбаністычная лірыка.

**Позняк Н. М. Опозиція «своє» / «чуже» в білоруській урбаністичній поезії.** У статті розглядається специфіка наявності антитези «своє» / «чуже» в межах білоруської урбаністичної поезії.

**Ключові слова:** міський текст, простір, літературний образ, урбаністична лірика.

**Позняк Н. М. Оппозиция «свое» / «чужое» в белорусской урбанистической поэзии.** В статье рассматривается специфика присутствия антитезы «свое» / «чужое» в границах белорусской урбанистической поэзии

**Ключевые слова:** городской текст, пространство, литературный образ, урбанистическая лирика.


© *Пазняк Н. М., 2011*

**Pozniak N. M. Opposition «Own» / «alien» in the Belarusian Urban Poetry.** The article considers the specificity of the presence of the antithesis of «his» / «alien» within the borders of Belarus urban poetry

**Key words:** urban text, space, literary image, urban poetry

**Пастаноўка навуковай праблемы і яе значэнне.** Антытэза «сваё» / «чужое» ў прасторы культуры і мастацтва сёння мае ўніверсальны характар. У апошні час яна становіцца прадметам разгляду вучоных розных гуманітарных галін ведаў. Назапашванне інфармацыі пра іншага ў мастацтве дазваляе вылучаць агульныя рысы, тыповыя або ўласцівыя пэўным прадметам, ацэньваць уласцівасці пэўнай з'вы як заканамернага факта або феномена пэўнай эпохі, таксама вызначаць спецыфіку нацыянальнага ў літаратурным працэсе.

Сцвярджэнне ўрбаністычнай тэматыкі ў беларускай паэзіі прыпадае на дваццатае стагоддзе. Звязана яно з агульнымі заканамернасцямі развіцця новага тыпу грамадства ў гэты час, нацыятворчым абгрунтаваннем беларускай культуры на працягу стагоддзя, дзе згаданая вышэй апазіцыя можа быць разгледжана як універсальная літаратуразнаўчая катэгорыя і як сэнсаўтваральная частка імагалагічнай праблемы паўставання этнанавобразаў у літаратуры.

Праблеме вывучэння ўрбаністычнай цывілізацыі, спецыфіцы рэпрэзентацыі гарадскіх топасаў і гарадскога тэксту ў апошні час прысвечана шмат прац як айчынных, так і замежных філосафаў, культуролагаў і літаратуразнаўцаў. Урбаністычная праблематыка сёння даволі сціпла даследавана беларускім літаратуразнаўствам, разгляду тэмы горада  ў літаратуры прысвечаны асобныя артыкулы і публікацыі М. Тычыны [1], А. Бязлепкінай [2], Л. Гарэлік [3], С. Грымуты [4], Л. Леські [5], М. Весялухі [6], М. Мартысевіч [7] і інш.

**Мэта нашага даследавання** – выявіць сутнасць апазіцыі «сваё» / «чужое» ў прасторы беларускай урбаністычнай паэзіі.

**Выклад асноўнага матэрыялу і абгрунтаванне атрыманых вынікаў даследавання.** На пачатку XX стагоддзя горад у еўрапейскай літаратуры атрымлівае прызнанне як крыніца лірычных перажыванняў, настолькі ж багатая, як і прырода. Па сутнасці, у гэты перыяд у еўрапейскай паэзіі фарміруецца некалькі фармальна адрозных мадэляў успрымання лірычным героем гарадскіх топасаў. Міфалагізаваны вобраз горада ствараецца ў паэзіі французкага сімвалізму, горад-спрут і горад-пачвара, які адштурхоўвае ад сябе, паўстае ў творчасці

Э. Верхарна, эсхаталагічнымі і тэхнакратычнымі настроямі поўняцца ўрбаністычныя творы экспрэсіяністаў і футурыстаў.

Зварот да тэмы горада ў беларускай літаратуры, заснаванай на народна-сялянскіх традыцыях, у параўнанні з літаратурай еўрапейскай, адбываецца даволі позна і няўпэўнена. Аднак, інтэнсіўнасць звароту беларускіх паэтаў да гарадской тэмы ўжо ў першай палове XX стагоддзя робіць актуальным пошук агульных заканамернасцей яе разгортвання ў лірычнай плыні, прымушае па-новаму глядзець на функцыю ўрбаністычных матываў у рэчышчы нацыянальнай мастацкай традыцыі.

Агульнапрынятым сёння з'яўляецца факт адкрыцця ўрбаністычнай тэмы ў беларускай літаратуры М. Багдановічам. Паэтычная нізка «Места» на пачатку стагоддзя вызначыла адзін з накірункаў мадэрнізацыі новай беларускай літаратуры.

Як адзначае І. Луцкевіч, першыя згадкі пра беларускі горад прысутнічаюць яшчэ ў вершаваных творах В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, Цёткі, але іх героі «...бачаць вонкавае хараство места вачыма селяніна» [8, 177], горад для іх з'яўляецца генетычна «чужым» моўным і сацыяльным асяроддзем, варожым да асобы па сваёй прыродзе.

Ухваленне горада як з'явы прагрэсіўнай, культуралагічна сваёй, тоеснай свядомасці нацыянальнага інтэлігента, у беларускай літаратуры адбылося ўпершыню ў творах М. Багдановіча. Адным з галоўных вобразаў цыкла паэта «Места» з'яўляецца вобраз старажытнай Вільні. Для аўтара яна не толькі велічны сімвал беларускай гісторыі, але і аснова для нацыянальнай самаідэнтыфікацыі лірычнага героя, яго спроба стаць «сваім» у межах урбаністычнай прасторы.

Падобны працэс у пазнейшы час можна назіраць у вершах аб Вільні М. Машары, Н. Арсеньевай, М. Танка, П. Панчанкі, А. Разанава, Р. Барадуліна, У. Караткевіча і інш.

Гістарычны міф пра Вільню як «крывіцкую Мекку», запачаткаваны яшчэ ў урбаністычных вершах У. Жылкі пачатку стагоддзя, так ці інакш транслiруецца ў беларускай паэзіі і сёння.

У працяг традыцыі М. Багдановіча, менавіта ў 20-я гг XX стагоддзя ў беларускай паэзіі з'яўляецца і паступова фарміруецца цэлая ўрбаністычная плынь. Да тэмы горада актыўна звяртаюцца А. Дудар, А. Александровіч, М. Чарот, М. Багун, А. Звонак, В. Маракоў, Ю. Лявонны, М. Лужанін, М. Хведаровіч і інш.

Апяванне індустрыяльнага будаўніцтва ў гэты час цесна звязана з падкрэсленай увагай да гарадскіх топасаў, спробай прачытання іх у паўсядзённым руху і фабрычным грукаце.

Прычым, шмат увагі ўрбаністычнай тэматыцы надаюць паэты, як вясковага, так і гарадскога паходжання. У творах апошніх паступова вымалёўваецца новы для урбаністычнай паэзіі вобраз Мінска. Які, у супрацьвагу «чужой» адраджэнніцкай канцэпцыі гістарычнай Вільні, захапляе лірычнага героя сваімі вуліцамі, крамамі, транспартнымі гукамі і тэлеграфнымі слупамі.

Матывы адчужанасці, немагчымасці да канца самаідэнтыфікавацца, вызначыцца ў полі апазіцыі «сваё» / «чужое», характэрныя для лірычнага героя сучаснай урбаністычнай паэзіі.

Сітуацыю ментальнага надлому можна назіраць у вершах А. Аркуша, Г. Булыкі, А. Мінкіна, С. Мінскевіча, А. Глобуса, В. Шніпа, Л. Сом, Д. Бічэль і інш.

Напрыклад, А. Мінкін у паэтычным цыкле «Гарады» выступае з «вечным» для беларускай культуры запытаннем / Да сэрца краю, да красуні Вільні // Я зноў і зноў вяртаюся няўхільна, // Каб выліць, што пячэ мяне знутры: // Скажы мне, Вільня, хто твой сын законны? [9, 98].

Не адчувае сябе да канца сваім” у сучаснай беларускай сталіцы і лірычны герой «Мінскіх санетаў» С. Мінскевіча / Таксама, вось і я ў горадзе сваім // Як быццам прыхадзень, турыст і пілігрым. // Перада мной ляжыць край родны, край знаёмы, // І разам з тым – чужы, нязносны, невядомы [10, 43].

Спроба замірыць ў свядомасці лірычнага героя дзве супрацьлеглыя ідэі прысутнічае ў вершах А. Глобуса / У Вільні снег. У Вільні цішыня. // У Вільні ўтульна і выдатна спіцца. // Мне Беларусь заўсёды ў Вільні сніцца // заможная, свабодная, мая…// У Мінску дождж. У Мінску мітусня.// У Мінску тлумна і няма спакою. // Тут не знаходзіш згоды сам з сабою. //, Ды толькі ў Мінску – на Радзіме я [11, 5].

Па словах С. Павлычкі, «…ва ўкраінскай літаратуры ператварэнне вясковай культуры ў гарадскую ніколі да апошняга не завяршалася, адносіны да горада сталі лакмусам пазіцыі мастака, а дыскурс горада пазначаны глыбокім і балючым канфліктам» [12, 206], справядліва дадзенае азначэнне і для стану сучаснай беларускай літаратуры.

**Высновы і перспектывы далейшага даследвання**. На нашу думку, разгледжаная вышэй праблема з’яўляецца прадуктыўным накірункам развіцця сучаснага беларускага літаратуразнаўства, патра-

бує далейшага падрабязнага асвятлення ў аспекце міжпрадметных сувязей з іншымі гуманітарнымі дысцыплінамі.

***Спіс выкарыстанай літаратуры***


1. Тычына М. А. Ад «антрапалагічнага крызісу» да «антрапалагічнага пераходу»: Homo ludens (чалавек урбаністычны) / М. А. Тычына [і інш.] // Чалавечае вымярэнне ў сучаснай беларускай літаратуры / навук. рэд. М. А. Тычына ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мн. : Беларуская навука, 2010. – С. 128–134.
2. Бязлепкіна А. П. Беларуская літаратура і гарадскі фольклор: стратэгія ўзаемадзеяння / А. П. Бязлепкіна // Беларускае літаратуразнаўства : навукова-метадычны зборнік. – Мн. : БДУ, 2010. – Вып. 8. – С. 23–27.
3. Гарэлік Л. «Я ў горадзе – гаротны, як ізгой…» Урбаністычныя матывы ў сучаснай паэзіі / Л. Гарэлік // Роднае слова. – 2001. – № 3. – С. 20–24.
4. Грымута С. Горад у паэтычным адлюстраванні М. Багдановіча (параўнальны аспект) / С. Грымута // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 2009. – № 5 (91). – С. 54–58.
5. Леська Л. П. Міф пра горад у мастацкім свеце Яна Баршчэўскага / Л. П. Леська // Нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах : міжнародная навуковая канферэнцыя, 19–20 верасня 2007 г.: [прысвеч. памяці народнага пісьменніка Беларусі І. Шамякіна]. У 2 ч. Ч. 2 / рэдкал. : І. Ф. Штэйнер (адказ. рэд.) [і інш]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2007. – С. 70–74.
6. Весялуха М. Паэзія У. Жылкі ў кантэксце ўрбаністычнай традыцыі / М. Весялуха // Творчасць Івана Навуменкі: славянскі, еўрапейскі, сусветны кантэкст : матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі (да 85-цігоддзя І. Я. Навуменкі) : [рэдкалегія С. С. Лаўшук і інш.]. – Мн. : Права і эканоміка, 2010. – С. 147–150.
7. Мартысевіч М. Апісаньне ляндшафту сучаснай беларускай паэзіі. Картаграфічны этуд / М. Мартысевіч // Arche Пачатак. – 2007. – № 5. – С. 119–125.
8. Луцкевіч А. Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва / Антон Луцкевіч ; уклад., прадм., пераклад з польск. і ням. А. Сідарэвіча. – Мн. : Кнігазбор, 2006. – 460 с.
9. Мінкін А. Пенаты : паэзія / Алег Мінкін. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2007. – 146 с. – (Галерэя «Б»).
10. Мінскевіч С. Менскія / Мінскія санеты / С. Мінскевіч. – Мн. : Логвінаў, 2002. – 64 с.
11. Глобус А. Новае неба : вершы / А. Глобус. – Мінск : Галіяфы, 2010. – 192 с. – (Другі фронт мастацтваў).
12. Павличко С. Д. Дискурс модернізму в українській літературі XX ст. / С. Д. Павличко. – 2-ге вид., переробл. і доповн. – К. : Либідь, 1999. – 447 с.